науч. трудов. Вып. 6—7. Ереван, 1988. С. 202.

[3] Брутян Г. А. Аргументация. Ереван, 1984. С. 9.

[4] Коллингвуд Р. Идея истории: Автобиография. М., 1980. С. 339.

[5] Бахтин М. М. Эстетика словесного творчества. М., 1979. С. 350.

Т. І. ГЛУШАКОВА

# БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ XVI СТ. ЯК ФАКТАР КУЛЬТУРНАГА ПЛЮРАЛІЗМУ І ТАЛЕРАНТНАСЦІ

Трагедыі і тупікі сучаснай цывілізацыі падводзяць нас да неабходнасці асэнсавання праблем дыялогу і суіснавання розных культур. Менавіта канец стагоддзя можа даць сучаснаму чалавеку рэдкую магчымасць — жывучы на сутыкненні эпох, паспрабаваць утварыць нейкую адзіную культурную прастору, у якой, у складаных дыялагічных адносінах адзін з другім, феномены культуры набудуць новы сэнс, магчымасць даваць адказы на пытанні і сумненні хворага чалавецтва. Наш зварот да «пошукаў у культуры» і тыя надзеі, якія звязваюцца з гэтым шляхам, павінны пачынацца з распрацовак праблем нацыянальнай культуры ў кантэксце яе сустрэч і ўзаемадзеяння з іншымі культурамі.

Філасофскае асэнсаванне праблем кантактаў культур можна знайсці ўжо ў кнізе Быцця, дзе распавядаецца гісторыя Вавілонскай вежы [1]. Бог, пакараўшы людзей, не адказаў ім у сваёй дапамозе. Ён проста даў ім другую перспектыву. Ступіўшы на цяжкі шлях рассейвання і дыферэнцыяцыі былога культурна-моўнага адзінства, замкнуўшыся на сваёй мове і сваёй культуры, людзі павінны былі зразумець і палюбіць гэтае «сваё», убачыць у гэтым «сваім», як у люстэрку, акружаючы іх свет, саміх сябе і, нарэшце, «другіх», адметных ад іх па мове і па культуры людзей. «Галоўны ўрок біблейскай гісторыі Вавілонскай вежы патрэбна бачыць у выбары культурна-моўнага плюралізму як новага шляху чалавека, у вылучэнні ідэі ўтварэння новага адзінства (ужо не прыродна-эмпірычнага) у разнастайнасці, новага брацтва людзей. І на гэтым шляху самым галоўным стала, помнячы аб «сваім», знаючы яго і прадаўжаючы паглыбляць гэтыя веды і тварыць новыя духоўныя каштоўнасці, зразумець «другога», ацаніць яго, навучыцца жыць разам, абменьвацца «сваім» і «чужым», звязваць тое і другое арганічна і натуральна» [2]. Няцяжка зразумець, што першапачатковае сутыкненне, сустрэча дзвюх, ці болей культур і моў, заўсёды ў гісторыі чалавецтва былі вельмі непрадказальнымі і выніковымі. Больш таго, такія сустрэчы заўсёды былі праверкаю на чалавечнасць. На жаль, гісторыя ведае нямала сумных прыкладаў, калі прадстаўнікі адной культуры знішчалі носьбітаў другой, не даючы ім выказаць сваю праўату, магчымасці ўглядзецца адзін у другога, устанавіць кантакт і паспрабаваць зразумець другі бок.

Парадоксаў у лёсе нашай нацыянальнай культуры было шмат. Найглыбейшы з іх заключаўся ў тым, што Беларусь адна з першых сярод іншых славянскіх народаў памкнулася да свайго нацыянальнага самавызначэння і амаль што апошняй, з вялікімі цяжкасцямі, спрабуе гэты працэс давесці да лагічнага завяршэння. У гэтай супярэчлівасці нацыянальна-культурнага лёсу нашай Беларусі ёсць багата старонак з найяскравейшымі прыкладамі натуральнага эксперыменту сустрэч двух тыпаў культур, які здзейсніўся гісторыяй і з якога вынікае шмат павучальных урокаў, не толькі дзеля саміх удзельнікаў гэтага грандыёзнага эксперыменту і іх нашчадкаў, але і дзеля ўсяго чалавецтва.

Нягледзячы на тое, што XVI ст. у жыцці краіны было вельмі складаным перыядам, у той жа час ён быў адным з найбольш цікавых і важкіх. Гэта быў той час, калі народ Беларусі актыўна і вынікова пачынае далучацца да агульнаеўрапейскага жыцця і асабліва да яго духоўнай культуры.

Своеасаблівасць культуры эпохі Адраджэння на Беларусі была абумоўлена цэлым шэрагам фактараў. І не ў апошнюю чаргу тымі абставінамі, што беларускі рэгіён на працягу стагоддзяў падвяргаўся ўздзеянню з боку магутнейшых і, у дадатак, палярных культур: з Усходу — грэка-візантыйскаму ўплыву (ці праваслаў'ю), а з Захаду — уплыву культурна-рэлігійных фармацый, узгадаваных пад знакам каталіцызму. Насельніцтва

Беларусі не зрабілася народам Усходу, але і не прыняло цалкам культуры Заходняй Еўропы. Шматвекавое ваганне паміж дзвюма культурамі, нарэшце, у XVI ст. прывяло да стварэння свайго, адметнага, асаблівага тыпу культуры.

XVI ст. — гэта час, калі працэсы этнагенезу беларусаў выйшлі на прамы шлях да свайго лагічнага завяршэння. І менавіта на гэты перыяд прыходзяцца першыя, і ў нечым неперавзыйдзеныя ў пазнейшых эпохах, вяршыні ўзлёту самасвядомасці беларускай нацыі. Чым жа тлумачыцца такі высокі інтэлектуальны ўзлёт беларускай самасвядомасці, які абумовіў дзейнасць Францыска Скарыны і які адлюстраваўся ў ёй? На наш погляд, пасылкамі тут могуць выступаць наступныя меркаванні. Па-першае, перадумовы такіх дасягненняў заключаліся ў шырокай магчымасці міжэтнічных культурных кантактаў. Па-другое, многанацыянальны характар Вялікага княства Літоўскага, утвараючы спрыяльныя ўмовы для засваення іншаэтнічнага культурнага вопыту, стымуляваў неабходнасць абароны і адстойвання айчыннай этнакультурнай традыцыі. І ў такіх выпадках уступалі ў моц два кампаненты этнічнай самасвядомасці: этнічная ідэнтыфікацыя (самааднясенне) і этнічны менталітэт (самасцвярджэнне). Эпоха Скарыны даследчыкамі (М. Багдановіч, Л. Гмырак, М. Шчакаціхін і інш.) яшчэ ў 20-я гады нашага стагоддзя была абазначана як эпоха гуманістычнага Адраджэння. Нядоўгі перыяд зацікаўленасці і распрацовак праблем айчыннай культуры, які выпаў на 20-я гады, быў спынены далейшай логікай развіцця працэсаў у нашай рэспубліцы ў 30—40-я гады. Фізічнае знішчэнне кадраў нацыянальнай культуры натуральна перарвала гэты працэс, але знішчыўшы носьбітаў ідэй, сістэма не змагла знішчыць самі гэтыя ідэі, далейшая распрацоўка якіх прадоўжылася, пачынаючы з 60-х гадоў. Распрацоўкі беларускіх навукоўцаў у розных галінах ведаў (філалогія, філасофія, мастацтва і г. д.) сёння ўжо бясспрэчна сведчыць, што беларуская культура XVI — першай палове XVII ст. мела пэўны набор светапоглядных і стылістычных характарыстык, тыпалагічных для гуманістычнага Адраджэння, альбо Рэнесансу. Гэта і станаўленне свецкіх мастацтваў, гуманітарнай навукі, літаратуры, нацыянальнай самасвядомасці, адкрыццё кнігадрукавання, гуманістычнай філасофіі. Беларускі філосаф Уладзімір Конан лічыць, што вывучаючы спецыфіку айчыннага Адраджэння, трэба размяжоўваць тэрміналагічна супадаючыя паняцці: Адраджэнне як эпоха ў развіцці культуры еўрапейскага рэгіёну ў пераходны перыяд ад Сярэднявечча да Новага часу і нацыянальнае Адраджэнне як заканамернасць у гістарычным развіцці народаў і пэўных рэгіёнаў, якая выяўляецца ў паскораным руху эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных працэсаў да больш высокіх форм грамадскага быцця і нацыянальнай свядомасці пасля працяглых перыядаў застою або ўпадку [3]. Адраджэнне ў значэнні культурна-гістарычнай эпохі было характэрна пераважна для краін Заходняй Еўропы, дзе ў развіцці пераважалі плаўнасць і паступальнасць. Для краін Усходу, і гэта асабліва адносіцца да нашага рэгіёну, Беларусі, дзе гістарычныя працэсы на працягу доўгага часу характарызаваліся катастрафічнасцю і нават перапыннасцю развіцця (у сілу мноства самых разнастайных прычын), было характэрна нацыянальнае Адраджэнне, якое гуманістычнае Адраджэнне ўключала як свой першы этап [4].

І сапраўды, прыглядзеўшыся да гістарычнага развіцця нацыянальнай культуры, можна заўважыць шэраг асаблівасцей, якія вылучаюць наш рэгіён у параўнанні не толькі з Захадам, але і з Усходам. Глыбінныя прычыны адметнасці працэсаў, характэрных для беларуска-украінскага рэгіёну, пачалі асэнсоўваць зусім нядаўна, але ўжо і зараз ёсць цікавыя згадкі. Адна з гіпотэз належыць украінскаму навукоўцу Г. Н. Вінаградаву, які ў сваім тлумачэнні гістарычных працэсаў, праходзячых у сярэднія вякі на нашай тэрыторыі, арыентуецца на тэорыю пасіянарнага штуршка Л. Гумілёва. Па Гумілёву, вось пасіянарнага штуршка прайшла з Поўначы на Поўдзень: ад Літвы да Эфіопіі. Вінаградаў лічыць, што літаральнае супадзенне восі пасіянарнага штуршка з мяжой культурных зон, якая прайшла па цэнтру ўкраінскіх і беларускіх зямель, падзяліўшы (у культурным сэнсе) тэрыторыю на Захад і Усход, і дало пачатак такім неадназначным і унікальным працэсам у рэгіёне [5]. Развіваючы думку Г. Вінаградава аб геаграфічным супадзенні восі пасіянарнага штуршка з культурнаю мяжою на нашай тэрыторыі, можна выказаць меркаванне, што менавіта гэты фактар стаўся асноўным падмуркам тых нацыянальна-адраджэнскіх з'яў, якія раз-пораз узнікалі ў айчыннай гісторыі, пакуль ў поўную моц не заявілі аб

сабе ў пачатку XVI ст. Першыя адраджэнскія прыкметы мы знойдзем ужо ў XI—XII ст., калі звернемся да дзіўных постацей першай асветніцы краю Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. Сапраўдны росквіт Полацкага і Турава-Пінскага княстваў, высокія праявы розных відаў мастацтва, імкненне да тыражавання ведаў, асветніцтва і амаль што неверагодная для гэтага часу рэнесансная пашана да асобы творцы — гавораць у карысць нашай думкі. Як піша У. Конан, «гэта быў тып раннехрысціянскага Адраджэння, народжанага сутыкненнем і сінтэзам стыхійных творчых парываў маладога, яшчэ нядаўна язычніцкага этнасу, візантыйскага элінізму і хрысціянскага духоўнага падзвіжніцтва» [6]. Гэты перыяд, а таксама больш пазнейшы, XIII—XV стст., найменш даследаваныя і асэнсаваныя ў культуралагічным плане пытанні гісторыі сярэдневечнай Беларусі. А цікавыя яны тым, што менавіта ў гэтыя часы ў рэгіёне пачынаюцца ўнікальныя, не маючыя аналагаў у гісторыі Еўропы, працэсы ў культурнай, рэлігійнай, этнічнай сферах. Можа, таму вельмі часта традыцыйныя метады і прыёмы, распрацаваныя ў навуцы на фундаменце вывучэння еўрапейскай і вяліка-рускай гісторыі, тут не працуюць. Другі этап адраджэнскіх працэсаў прыпадае на XIII—XV стст. Менавіта ў гэтым гістарычным адрэзку завяршылася станаўленне беларускай народнасці, старабеларускай мовы, этнічных, стыхійна-народных форм культуры. «Адбывалася як быццам бы вяртанне яе да першапачатковай прастаты, аднак не ў выглядзе рэгрэсіўнага, «зваротнага» руху. Гэта быў складаны сінтэз — з далучэннем да славяна-візантыйскіх традыцый, новых для гэтага рэгіёну еўрапейскіх творчых імпульсаў» [7].

Гэтыя думкі Уладзіміра Конана хацелася б развіць далей. На наш погляд, адраджэнчаскія працэсы ў вялікай меры «правацыраваліся» рэлігійнай думкай, уздзеяннем мноства рэлігійных ідэй, цыркуляваўшых на гэтай тэрыторыі. Глыбокае ўспрыманне рэлігійнай хрысціянскай традыцыі (а гэта была галіна грэка-візантыйскага хрысціянства), якая прыйшла звонку ў X ст. выключна інтэнсіўна стымулявала культуратворчасць народа-рэцыпіента (у дадзеным выпадку народаў, якія насялялі тэрыторыю Беларусі). Тагачаснае беларускае грамадства яшчэ не мела выпрацаванай асабістай культурнай традыцыі (маецца на ўвазе — хрысціянскай традыцыі), таму прыняцце хрысціянства выявіла і ўскалыхнула сілы, якія былі да таго ў спакою. Ефрасіннеўскае Адраджэнне — найяскравейшы таму прыклад. XIII—XV стст. — час актыўнага пранікнення на Беларусь другой хрысціянскай плыні — каталіцызму. Вынікі ўздзеяння апошняга былі трохі іншымі, бо ў гэтым выпадку за плячыма беларусаў было ўжо багатае духоўнае жыццё. Успрыманне новай рэлігійнай традыцыі прывяло да абнаўлення культурнага жыцця, вяртання да «першапачатковай прастаты», як піша Конан, але ўжо на іншых, больш глыбокіх асновах.

Сучасныя пошукі цывілізацыйным чалавецтвам адзінства, цэласнасці, у тым ліку і ў сферы рэлігійнай, якія толькі пачынаюць акрэслівацца, маюць, на наш погляд, некаторыя непасрэдныя аналогіі ў далёкім мінулым нашай Бацькаўшчыны. XVI—XVIII стст. для Беларусі і народаў, якія яе насялялі — гэта час каласальных рэлігійных узрушэнняў і перажыванняў, час пошукаў свайго нацыянальнага і рэлігійнага «я», гэта значыць, свайго «асаблівага», і ў той жа час — гэта дзіўная цяга і пошукі шляху да еднасці, да кампрамісаў і цярпімасці. Дыялог культур, які завязаўся праз суіснаванне і ўзаемадзеянне самых розных рэлігій на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, які расцягнуўся на многія стагоддзі, нарадзіў такі ўнікальны і найцікавейшы феномен, як талерантнасць. Менавіта талерантнасці, што сталася важным элементам дзяржаўнай палітыкі і арганічна ўвайшла ў структуру менталітэту народаў, якія традыцыйна жылі ў гэтым рэгіёне, наканавана было даць пачатак працэсам нацыянальнага Адраджэння ў пачатку XVI ст.

[1] Біблія. II, 1—9.
[2] Т о п о р о в В. И. // Восток — Запад: Исследования. Переводы. Публикации. М., 1989. Вып. 4. С. 10.
[3] Культура народов ВКЛ и Белоруссия XIII — начала XX века: Тез. межд. науч. конф. Гродно, 1991. 22—24 октября. С. 293.
[4] Там жа. С. 294.
[5] Там жа. С. 227.
[6] Там жа. С. 295.
[7] Там жа.